■ Не прапусціце!

# БЯСПЛАТНА ЗАКАДЗІРАВАЦЦА МОЖНА Ў КАСТРЫЧНІКУ

**Сеансы бясплатнага кадзіравання ад алкагалізму пройдуць у Мінску з 7 па 12 кастрычніка. Аб гэтым «Звяздзе» паведамілі ў Камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама. Запісацца на бясплатнае лячэнне можна да 27 верасня. Для гэтага неабходна патэлефанаваць па нумарах 237-37-01, 292-31-03.**

«Каб прыняць удзел у акцыі па бясплатным кадзіраванні і «падшыўцы», неабходна перш за ўсё жаданне самога чалавека пазбавіцца ад алкагольнай залежнасці, наяўнасць пашпарта, а таксама ўстрыманне ад ужывання алкаголю не менш за 10 дзён, — пракансультаваў **намеснік галоўнага ўрача гарадскога клінічнага наркалагічнага дыспансера Аляксандр Алішэвіч.** — У акцыі не змогуць прыняць удзел непаўналетнія, а таксама людзі пенсійнага ўзросту. Перш чым прайсці лячэнне, трэба будзе пракансультавацца з урачом, які вызначыць гатоўнасць арганізма да «падшыўкі» або кадзіравання».

Сеансы бясплатнага кадзіравання ад алкагалізму пройдуць па вуліцы Някрасава, 22/1. Паводле слоў Аляксандра Алішэвіча, лячэнне «падшыўкай» прадугледжвае імплантацыю прэпарата «Эспераль», кадзіраванне ўяўляе сабой псіхатэрапеўтычны сеанс з элементамі ўнушэння.

Упершыню акцыя набудзе масавы характар. Летась у Мінску падчас падобнай акцыі, прымеркаванай да Сусветнага дня псіхічнага здароўя, бясплатна лячылі ад алкагалізму толькі тых людзей, якія трапілі ў поле зроку праваахоўных органаў.

**Надзея ПАЎЛАВА**

■ Экаасяроддзе

# АЎТАМЕСЦА ПУСТЫМ НЕ БЫВАЕ!

**Асабліва калі размова ідзе пра сталічныя двары і цэнтр горада. Што тут таіць, ёсць у сутках некалькі гадзін, падчас якіх ухітрыцца прыпаркаваць сваю машыну хоць куды-небудзь — амаль як выйграць джэкпот у латарэю. Мой бацька меў неасцярожнасць заехаць у госці вечарам пятніцы, калі суседзі ўжо вярнуліся з працы і шчыльна паставілі свае аўтамабілі па ўсім перыметры вузенькага «хрушчоўскага» двара. Паркавацца давялося амаль за два прыпынкі ад дома. Тыя ж суседзі часам гучна высвятляюць пад вокнамі, чыя машына павінна стаяць на тым ці іншым месцы, а калі ў нейкай сям'і набываюць другое аўто, гэта ўспрымаецца іншымі аўтаўладальнікамі як асабістая трагедыя. Праблемы, але што тут рабіць? Не забараняць жа «аўтамабілізацыю». Эксперты-эколагі прапануюць сваё рашэнне: варта зрабіць паркоўку на ўсёй грамадскай зямлі, у тым ліку і на дваровых тэрыторыях, платнай...**

## ПАРКУЕМСЯ «ПА-РЫНАЧНАМУ»!

— Сёння толькі чвэрць аўтамашын, зарэгістраваных у сталіцы, забяспечаны парковачнымі месцамі, — гаворыць супрацоўнік праграмы па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця Цэнтра экалагічных рашэнняў Ганна Малышкіна. — У многіх замежных краінах, як толькі ўзровень аўтамабілізацыі насельніцтва становіцца надта высокім, уводзіцца сістэма платных парковак. Адзін з варыянтаў (ён называецца «Паркоўкі па рынкавых прынцыпах»), які б дапамог у вырашэнні гэтай праблемы, складаецца з трох этапаў. Па-першае, трэба стварыць адзіную, абсалютна новую структуру парковачных службаў; па-другое, ускласці адказнасць за нелегальную паркоўку на ўладальніка аўтамабіля (у такім выпадку для фіксацыі парушэння не абавязкова будзе яго прысутнасць, асобу вызначаць па дзяржнумары), а не на вадзіцеля, як гэта адбываецца сёння. І галоўнае — зрабіць платным права ставіць машыну на ўсёй грамадскай зямлі ў горадзе, у тым ліку і на дваровых тэрыторыях. У цэнтры будзе адзін кошт, на ўскраіне — зусім іншы.

Як патлумачыла Ганна, гэта прымусіць кіроўцаў лішні раз падумаць: ехаць у час пік у цэнтр горада на ўласным аўто альбо скарыстацца грамадскім транспартам. Атрымаецца, што вулічна-дарожныя сеткі будуць эксплуатавацца больш эфектыўна, а экалагічная нагрузка на наваколле будзе зменшана. Перш чым прапанаваць гэты праект у Беларусі, быў вывучаны вопыт Даніі, дзе нешта падобнае існуе досыць паспяхова.

## БЯСПЛАТНАЯ ПАРКОЎКА ЯК СУБСІДЫЯ

— Магчымасць бясплатна ставіць аўто на грамадскай зямлі, як гэта адбываецца цяпер у беларускай сталіцы — своеасаблівая субсідыя для аўтаўладальнікаў, — лічыць дырэктар мясцовага фонду «Экалагічны транспарт» Джон Росмэн. — У Мінску, як і ў любым вялікім горадзе, ёсць праблема з недахопам парковачных месцаў, таму ўлады зацікаўлены ствараць у сталіцы дадатковыя паркоўкі. Як правіла, пры іх будаўніцтве здымаецца верхні ўрадлівы слой глебы, а тэрыторыя асфальтуецца, а гэта значыць, што зялёных зон становіцца ўсё менш і менш. Яшчэ можа быць так: машыны ў двары няма дзе паркаваць, акрамя як на газоне, і з цягам часу трава на ім перастае расці. А калі так адбываецца, то гэтую тэрыторыю дазваляецца заасфальтаваць.

На думку Джона Росмэна, горад мог бы дзякуючы ўвядзенню аплаты сабраць грошы, што ляжаць літаральна «на дарозе». Калі вярнуцца да параўнання бясплатнай паркоўкі з субсідыяй, то варта падумаць, каму менавіта выпадзе ёй карыстацца. Субсідыя, вядома, даецца альбо тым, каму трэба дапамагчы, альбо тым, хто заслугоўвае заахвочвання.

У Мінску няшмат жыхароў, што маюць машыны і пры гэтым амаль імі не карыстаюцца. Такія людзі ёсць хіба што сярод пенсіянераў, якія пару разоў на год «катаюцца» на дачу. Магчыма, якраз для іх і ёсць сэнс пакінуць права бясплатна паркавацца.

Большасць жа штодзённа ездзіць на працу і па справах, паркуецца ў розных месцах. Як вядома, вялікая колькасць аўто ў горадзе адмоўна адбіваецца на экалагічным стане наваколля. Атрымліваецца, раз ёсць магчымасць бясплатна паставіць машыну дзе заўгодна, людзі актыўна ёй карыстаюцца, а паветра, якім мы дыхаем, становіцца ўсё горшым.

**Стварэнне такіх вось часовых парковачных месцаў, якія робяцца па заказе і за кошт аўтаўладальніка, — справа вельмі зручная найперш таму, што ў машыны ёсць пэўнае месца, а значыць, аўтаўладальнік будзе яго прытрымлівацца.**



**Атрымліваецца, што ў экалагічным сэнсе адзінае адрозненне экапаркоўкі ад нелегальнай на газоне — адсутнасць адказнасці аўтаўладальніка за сапсаваную зялёную зону.**

## ПАДВЁЎ ЗАБУДОЎШЧЫК — ЗБІРАЙ НА ГАРАЖ...

Праблема парковачных месцаў часта ўзнікае па віне забудоўшчыкаў, лічыць намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі» Аляксандр Ліштван.

— Па нормах паркоўкі ля жылых дамоў павінны праектавацца з разлікам «адна машына на адну кватэру». Але паколькі зямля дарагая, і за яе хочацца атрымаць максімальны прыбытак, можна сутыкнуцца з такімі сітуацыямі: ля 19-павярховага дома можна паставіць усяго шэсць машын, — расказвае Аляксандр Віктаравіч.

Па яго словах, у Мінску сёння каля 800 тысяч аўтамабіляў, крыху больш за 600 тысяч з якіх належаць грамадзянам. Забяспечана стаянкамі ўсяго каля 160 тысяч адзінак транспарту, і гэта з улікам платных паркінгаў. Дарэчы, платных парковак у сталіцы налічваецца 26, маецца і арганізацыя, якая выконвае функцыі парковачнай службы — гэта дзяржаўная ўстанова «Паркоўкі сталіцы». Паціху ўводзяцца і аўтаматызаваныя паркоўкі. А што датычыць розных коштаў за стаянку аўто ў цэнтры і на ўскраінах, то такая практыка ў Мінску ёсць ужо цяпер. Для тых, хто не мае месца, каб паставіць аўтамабіль ля дома, і не жадае звяртацца да паслуг платных стаянак, ёсць варыянт набыць кватэру ў доме, дзе прадугледжаны падземны гараж. Але такое задавальненне каштуе нятанна — ад 17 да 25 тысяч долараў.

## ЭКАПАРКОЎКА — ЗУСІМ НЕ «ЭКА»?

Колькі часу таму мінчанам ужо прапаноўвалі вырашыць праблему парковак «экалагічна».

— Многія аўтаўладальнікі ведаюць пра «экапаркоўкі». На неасфальтаваную тэрыторыю ўсталёўваецца спецыяльная рашотка, крыху прыўзнятая над зямлёй. Рашотка і машыну на сабе трымае, і як бы павінна не перашкаджаць расці траве, — расказвае супрацоўнік праграмы па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця Цэнтра экалагічных рашэнняў Ганна Малышкіна.

Вытворцы, калі прапаноўваюць свой тавар, распавядаюць пра яго найлепшыя якасці. Па-першае, не патрэбна распрацоўка праекта: усталяваць экапаркоўку можна практычна на любым месцы ў двары, па-другое, такая паркоўка нібыта не шкодзіць грунту і траве.

Па словах Ганны Малышкінай, ва ўмовах нашай краіны гэта не вельмі падыходзячы варыянт. Дажджы і снег размываюць грунт, і ў выніку рашотка не вытрымлівае вагу машыны і прасядае, літаральна «ўціскаецца» ў зямлю. Да таго ж па нашых дарогах, здараецца, ездзяць не самыя новыя аўтамабілі, з якіх паліва часам працякае на зямлю і забруджвае глебу. Такія прыклады можна бачыць у многіх мінскіх дварах. Атрымліваецца, што ў экалагічным сэнсе адзінае адрозненне экапаркоўкі ад нелегальнай на газоне — адсутнасць адказнасці аўтаўладальніка за сапсаваную зялёную зону. Слова «экапаркоўка» зусім не адпавядае сутнасці.

На гэты конт намеснік дырэктара ЖЭУ Савецкага раёна г. Мінска Ала Іжэўская адказвае наступнае:

— У 2011 годзе гарадскімі ўладамі сапраўды было прапанавана размяшчаць на адкрытых дваровых пляцоўках часовыя парковачныя месцы (гэта не экапаркоўкі, бо для іх абсталявання сапраўды патрабуецца спецыяльная служба), у нас для гэтых мэтаў выкарыстоўваецца поліпрапіленавае пакрыццё. Калі жыхары дамоў займаюць сваімі машынамі «зялёную тэрыторыю», мы стараемся ўсімі сіламі з гэтым змагацца. Супрацоўнікі ЖЭУ альбо самі складаюць пратаколы, альбо перадаюць фота машыны ў Дзяржаўтаінспекцыю. Але многія аўтаўладальнікі вымушаны парушаць правілы паркоўкі, бо ля дамоў старой забудовы маленькія двары і вузкія праезды.

Стварэнне такіх вось часовых парковачных месцаў, якія робяцца па заказе і за кошт аўтаўладальніка, — справа вельмі зручная найперш таму, што ў машыны ёсць пэўнае месца, а значыць, аўтаўладальнік будзе яго прытрымлівацца і не паставіць сваю машыну так, каб перашкаджаць праязджаць іншым. У Савецкім раёне сталіцы дзякуючы поліпрапіленавым плітам з'явілася каля 300 дадатковых парковачных месцаў. Але, па словах Алы Іжэўскай, вырашыць «парковачную» праблему горада за кошт двароў проста немагчыма. Застаецца толькі здагадвацца, ці прыйдзецца даспадобы ў сталіцы ідэя паўсюднай платнай паркоўкі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже имущества (в комплексе) в составе:**

| № | наименование | общ. пл., кв.м | инв. № |
|---|---|---|---|
| 1 | корпус № 1 с четырьмя пристройками и галереей | 6947.1 | 610/С-53930 |
| 2 | корпус № 2 с тремя пристройками и переходной галереей | 9599 | 610/С-53935 |
| 3 | пристройка к корпусу № 1 (изготовление футора) | 1535.4 | 610/С-53920 |
| 4 | цех сувениров | 290,2 | 610/С-53934 |
| 5 | цех ширпотреба | 1872.6 | 610/С-1575 |
| 6 | участок обработки чугунных рам с тремя пристройками | 507.5 | 610/С-53931 |
| 7 | РМЦ с пристройкой | 1161,2 | 610/С-53918 |
| 8 | прирельсовый склад хранения лаков и красок | 424.3 | 610/С-53946 |
| 9 | склад готовой продукции | 717 | 610/С-53933 |
| 10 | электроцех, цех раскроя фанеры, компрессорная | 639,2 | 610/С-53929 |
| 11 | здание растворобетонного узла | 20,3 | 610/С-53921 |
| 12 | бойлерная с пристройкой | 278.6 | 610/С-53925 |
| 13 | здание трансформаторной подстанции с пристройкой | 350,1 | 610/С-53943 |
| 14 | насосная станция1-го подъема | 94.8 | 610/С-53937 |
| 15 | насосная станция 2-го подъема | 63,1 | 610/С-53938 |
| 16 | пост приема и выдачи нефтепродуктов | 47.3 | 610/С-53945 |
| 17 | станция перекачки | 41,8 | 610/С-53944 |
| 18 | капитальное строение (низконапорная станция перекачки сточных вод) | | 610/С-53941 |
| 19 | навес для ПВМ | 45 | 610/С-53940 |
| 20 | эстакада | | 610/С-53942 |
| 21 | склад ГСМ | 68.3 | 610/С-53936 |
| 22 | цех металлодеталей с тремя пристройками | 1924.9 | |
| 23 | химлаборатория с двумя пристройками (гараж, гараж автотракторный) | 630.5 | |
| 24 | сушильно-раскроечный цех с тремя пристройками | 4421,5 | |
| 25 | цех лесопильный с двумя пристройками | 1080,5 | |
| 26 | котельная с двумя пристройками | 1380.5 | |
| А также: труба дымовая, ворота механизированные, ограждение, дороги асфальтированные, проезды и площадки, сети водопровода, сети канализации, электросиловое хозяйство, хозяйство мазутное. | | | |
| Указанные объекты расположены на земельном участке, площадью **6.4375 га** (предоставлен на праве постоянного пользования) с кадастровым номером 640400000008000182, расположенном по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. | | | |
| 27 | изолированное помещение, наименование - помещение центрального склада | 583,8 | 610/D-54608 |
| Объект расположен на земельном участке, площадью **0,2495 га** (предоставлен на праве аренды), с кадастровым номером 620850100008001023 по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36/21-3 | | | |
| 28 | **оборудование согласно перечню (перечень находится у организатора аукциона)** | | |

Начальная цена с НДС — **19 110 064 200** бел. руб. **Задаток 5 % от начальной цены (955 503 000 бел. руб.), перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, УНП 690324015.** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Фактические затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущие извещения о проведении торгов опубликованы в газете **«Звязда» за 24.07.2013, 27.08.2013 и 11.09.2013.** Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **08.10.2013** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **07.10.2013** до 12.00 по указанному адресу.

**Тел: (8017) 224-61-34, (8029) 102-21-17.**

**Логойский районный исполнительный комитет СООБЩАЕТ о проведении 25 октября 2013 года**

**ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ**

**в частную собственность для строительства магазина, для строительства индивидуальных жилых домов и аукциона на право заключения договоров аренды на земельные участки.**

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельного участка в частную собственность юридических лиц** | | | | | | |
| 1 | гп. Плещеницы, ул. Кирова, кадастровый номер 623255700001955, земельный участок для строительства магазина | 0,0600 | Наличие всех коммуникаций | 26 065 980 | 1 833 950 + 84000 + 972 000 + публикация в газете | 2 606 598 |
| **Аукцион на право заключения договора аренды** | | | | | | |
| 1 | гп. Плещеницы, пер. Чкалова, кадастровый номер 623255700002079, земельный участок для строительства площадки складирования материалов | 0,3185 | - | 2 375 064 | 5 963 767+ 300 000+ 972 000+ публикация в газете | 237 506 |
| 2 | аг. Острошицы, ул. Центральная, Логойский район, Минская область | 0,2014 | Наличие всех коммуникаций | 8 920 621 | 5 362 168+ 300 000 + публикация в газете | 892 062 |
| 3 | г. Логойск, Минская область, Логойский район, земельный участок расположен на пересечении ул. Гайненское шоссе и пер. Гайненского | 0,7276 | Наличие всех коммуникаций | 498 741 800 | 11 846 019+ 300 000+ публикация в газете | 49 874 180 |
| 4 | г. Логойск, ул. Тенистая | 0,1013 | Наличие всех коммуникаций | 5 829 868 | 5 399 075 + 300 000 + 345 600 + публикация в газете | 582 986 |
| **Аукцион по продаже земельного участка гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания жилых домов** | | | | | | |
| 1 | г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой», У-194 с кадастровым номером 623250100002492, для строительства и обслуживания жилого дома | 0,1000 | Разрабатывается проект на водоснабжение | 44 427 000 | 1 844 256 + 50 000 + 864 000 + публикация в газете | 4 442 700 |
| 2 | г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой», У-200 с кадастровым номером 623250100002495, для строительства и обслуживания жилого дома | 0,1001 | Разрабатывается проект на водоснабжение | 44 471 430 | 300 000 + 1 844 256+ публикация в газете | 4 447 143 |
| 3 | г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой», У-195 с кадастровым номером 623250100002493, для строительства и обслуживания жилого дома | 0,1001 | Разрабатывается проект на водоснабжение | 44 471 430 | 300 000 + 1 868 309+ публикация в газете | 4 447 143 |
| 4 | г. Логойск, микрорайон жилой застройки «Луговой», ул. Камышовая, д. 10 с кадастровым номером 623250100002339, для строительства и обслуживания жилого дома | 0,1000 | Разрабатывается проект на водоснабжение | 45 330 600 | публикация в газете | 4 533 060 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3641061100212 в ЦБУ № 611 филиала № 500 – Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 601, в г. Логойске, получатель – Логойский райисполком УНН 600181814.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и с земельными участками, выставляемыми на аукцион. Порядок поведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 25 октября 2013 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, третий этаж, актовый зал. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15 (каб. 114). Последний день приема заявлений 22 октября 2013 года до 17.00. Контактные телефоны: (801774) 55 0 38, 52 7 20, 52 7 15, 21 0 22. Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by.

## Извещение о проведении аукциона

**Жарский сельский исполнительный комитет Ушачского района Витебской области ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже земельного участка для строительства и обслуживания жилого дома гражданам Республики Беларусь, расположенного на территории сельсовета**

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь земельного участка (га) | Наличие инженерных сетей | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Городец 224982402601000047 | 0,1970 | Сети электроснабжения | 4915590, кроме расходов на организацию и проведение аукциона | 15000000 | 1500000 |
| 2 | д. Городец 224982402601000048 | 0,2500 | Сети электроснабжения | 5137764, кроме расходов на организацию и проведение аукциона | 10000000 | 1000000 |

Задаток перечисляется на р/с 3641328040935 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНП 300007203, ОКПО 28677767, код платежа 04901 Жарский сельисполком.

Порядок проведения аукциона оговорен в положении о его проведении.

Аукцион состоится 28.10.2013 г., начало в 12.00 по адресу: д. Жары, ул. Центральная, 18 (здание сельисполкома) Ушачского района Витебской области.

**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25 октября 2013 года до 17.00 по вышеуказанному адресу.**

**Телефоны (80158) 2 36 42, 2 36 43.**


■ Пад кантролем

# РЭЛІГІЙНЫЯ СЛУЖБЫ — У АСОБНЫХ ПАКОЯХ З ЗАХАВАННЕМ ПАЖАРНАЙ БЯСПЕКІ

**Мінскае абласное ўпраўленне МНС прапануе стварыць у дамах-інтэрнатах і ўстановах аховы здароўя з кругласутачным знаходжаннем там людзей пакоі для правядзення рэлігійных службаў — у асобных будынках з забеспячэннем патрабаванняў пажарнай бяспекі.**

Падчас праведзенага работнікамі ўпраўлення маніторынгу дамоў з кругласутачным знаходжаннем састарэлых жыхароў былі выяўлены парушэнні правілаў пажарнай бяспекі пры арганізацыі абслугоўвання, а менавіта выкарыстанне крыніц адкрытага агню падчас богаслужэнняў, што можа стаць прычынай узнікнення пажару.

Напрыклад, ахвярамі жудаснага пажару ў пасёлку Раменскі Маскоўскай вобласці сталі супрацоўнікі і пацыенты псіханеўралагічнай клінікі № 14 — усяго 38 чалавек. Выратавацца ўдалося толькі аднаму пацыенту і двум супрацоўнікам клінікі. Калі а палове трэцяй гадзіны ночы здарылася бяда, з-за адпаведных мер бяспекі ў бальніцы (замкнутых дзвярэй медустановы і металічных кратаў на вокнах) тыя, хто знаходзіўся ўнутры, не змаглі самастойна выйсці...

У Мінску работнікам МНС неяк давялося выязджаць на пажар у адну з кватэр. Высветлілася, што ён узнік з-за пакінутай без нагляду памінальнай свечкі каля труны памерлай жанчыны. Агонь пашкодзіў маёмасць, закрануўшы і труну з целам... Жыхароў суседніх кватэр давялося эвакуяваць.

**Сяргей РАСОЛЬКА**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

объекта «Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Каменная Горка-2 со встроенно-пристроенными помещениями в границах ул. Проектируемой № 6 и ул. Колесникова».

**Жилой дом № 43 по генплану**

**ДОЛЕВОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО НА КОММЕРЧЕСКОЙ ОСНОВЕ**

**ИНФОРМАЦИЯ О ЗАСТРОЙЩИКЕ:**

Общество с ограниченной ответственностью «ИНТЕХНОСТРОЙ», зарегистрированное решением Мингорисполкома от 17 июля 2003 года № 1193 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100980743, находящееся по адресу: город Минск, Старовиленский тракт, дом 10, помещение 5Н (свидетельство о государственной регистрации № 0092106, выдано Мингорисполкомом 28.07.2003). Режим работы: с 09.00 до 17.30. Обеденный перерыв: с 13.00 до 13.30. Выходные дни: суббота и воскресенье.

Застройщик принимал участие в строительстве объектов: «Строительство многоквартирного жилого дома по ул. Ауэзова, 8» (сроки строительства 15.07.2011-10.01.2013) и «Многоквартирные жилые дома в микрорайоне Каменная Горка-5 со встроенно-пристроенными помещениями по ул. Проектируемой № 3 (объект № 40 по генплану). Жилые дома № 40А, 40Б по генплану» (15.07.2011-29.12.2012).

**ИНФОРМАЦИЯ О ПРОЕКТЕ СТРОИТЕЛЬСТВА:**

**Цели проекта строительства:** строительство многоквартирного жилого дома.

**Сведения об этапах и о сроках реализации проекта:** этапы отсутствуют; сроки реализации: 10.06.2013-31.07.2014.

**Результаты государственной экспертизы проектной документации:** экспертное заключение ДРУП «Госстройэкспертиза по г. Минску» от 30.11.2012 № 831-60/12 и 15.05.2013 № 168-60/13.

**Сведения о месте нахождения строящегося многоквартирного жилого дома и его характеристики:** 4-подъездный 10-этажный 159-квартирный жилой дом серии М464-У1 находится в границах улиц Проектируемой № 6 и ул. Колесникова в микрорайоне Каменная Горка-2 в г. Минске. Остекление лоджий: да. Технический этаж: да. Лифт: Четыре. Помещение для хранения автомобилей и мотоциклов: нет. Помещение для размещения штатных работников товарищества собственников: да.

**Сведения о ценах на объекты долевого строительства (на дату опубликования проектной декларации) и их количестве, предлагаемых для заключения договоров в данном многоквартирном жилом доме:**

| тип квартиры | площадь по СНБ (м.кв.) | стоимость 1 кв.м, белорусских рублей | цена объекта долевого строительства, белорусских рублей | количество квартир | № квартир |
|---|---|---|---|---|---|
| **3к-2** | **79,14** | **12 800 000** | **1 012 992 000** | **2** | **9, 13** |
| **3к-1*** | **79,22** | **12 800 000** | **1 014 016 000** | **6** | **12, 16, 52, 56, 91, 95** |
| **3к-2*** | **79,22** | **12 800 000** | **1 014 016 000** | **4** | **49, 53, 88, 92** |
| **ИТОГО для заключения договоров долевого строительства предлагаются** | | | | **12 квартир** | |

Цена объекта долевого строительства может быть изменена Застройщиком в одностороннем порядке в случаях изменения законодательства об уплате косвенных налогов, изменения статистических индексов стоимости строительно-монтажных работ до истечения срока исполнения застройщиком обязательств по договору.

При единовременной оплате дольщиком цены объекта долевого строительства дольщику предоставляется скидка.

**Данные о правах застройщика на земельный участок:** составленные РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» свидетельства (удостоверений) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на них от 14.06.2013 №№ 500/1323-2349 (0,2581 га, право собственности Республики Беларусь, право постоянного пользования ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ») и 500/1323-2350 (0,5513 га, право собственности Республики Беларусь, право временного пользования ООО «ИНТЕХНОСТРОЙ»).

**Границы земельных участков:** ограничены с севера жилым домом № 40 по генплану; с юга улице Лидской; с востока земельным участком для строительства дома № 44 по генплану; с запада строительной площадкой дома № 46 по генплану.

**Данные об элементах благоустройства:** автомобильная парковка на 51 машино-место; детская площадка, плиточное покрытие; озеленение территории с установкой малых архитектурных форм.

**Количество в строящемся многоквартирном жилом доме самостоятельных частей, передаваемых застройщиком дольщикам после утверждения в установленном порядке акта приемки в эксплуатацию жилого дома и связанных с ним иных объектов недвижимости:** 12 квартир.

**Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме, не входящих в состав общего имущества в таком доме:** нет.

**Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме и иных объектах недвижимости, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода в эксплуатацию указанных объектов недвижимости и передачи объектов долевого строительства дольщикам:** межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

**Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию строящегося многоквартирного жилого дома:** 31 июля 2014 г.

**Сведения о договорах строительного подряда, заключенных застройщиком:** договор строительного генподряда от 24 мая 2013 г. N 64/08-13, заключенный с ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству:** по согласованию с Застройщиком в установленное им время и в присутствии его уполномоченного представителя с соблюдением требований техники безопасности.

**Уполномоченный представитель Застройщика:** общество с ограниченной ответственностью «Сильван»; г. Минск, ул. Я. Купалы, д. 17/30; тел. 8 017 222 38 91, 8 017 222 38 17, 8 029 318 38 91.

**Считать недействительными страховые полисы ЗАО «СК «Белросстрах»:**

— добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ №№ 1051864, 1051867, 1051879, 1051880, 1079810,

0953193, 0953194, 0953199, 0961719, 1002058, 1002060, 1018503, 1018505, 1032062, 1032063, 1032068, 1032069, 1032083, 1032084, 1032085, 1042271, 1074529, 1074532, 1083581, 1086074, 1086075, 1086076, 1086171, 1086172, 1086197, 1099227, 1099254, 1099261, 1099334, 1103877, 1103893, 1103921, 1103922, 1106201, 1106232, 1106283, 1106284, 1108044, 1108071, 1108076, 1108097, 1116958, 1118981, 1118982, 1130909, 1130910, 1130936, 1130937, 1140253, 1140954, 1140955, 1144807, 0809323, 0888328, 1014210, 1014211, 1031073-1031090, 1083785, 0778668, 0789841, 1049575, 1049576, 1019369, 1121715, 1121718

— страховой полис комбинированный «Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско); Добровольное страхование от несчастных случаев» (2РН, 2РП) сер. БИ №№ 0003455, 0003456

— квитанции 1 СУ серия КС №№ 0915896, 0921161, 0928483, 3474184, 3474195, 3479312,

3837121, 0291551, 3478916, 0915836, 0281929, 0286545, 0286976

— добровольное страхование от несчастных случаев (2РН) серия НК №№ 0001143, 0001144, 0001744, 0000914, 0000915

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество

**«Акционерный сберегательный банк «Беларусбанк»**

СООБЩАЕТ о проведении 9 октября 2013 года 80-го тиража выигрышей по выигрышным вкладам в белорусских рублях в филиале №510 ОАО «АСБ Беларусбанк» по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, 18 (комн. 302 а). Начало тиража в 11.00.

**Телефон для справок:** 147 Контакт-центр.

Информация о процентах, выплаченных по различным видам вкладов, депозитов в течение последнего финансового года с разбивкой по месяцам размещена на сайте www.belarusbank.by

Сохранность и возврат вкладов гарантируется в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**Открытое акционерное общество «МинскСортСемОвощ» сообщает кредиторам Общества**

об уменьшении уставного фонда в соответствии с решением внеочередного общего собрания акционеров от 24.09.2013. Новый размер уставного фонда составляет 132268500 рублей. Требования кредиторов Общества принимаются по адресу: 220014, г. Минск, ул. Минина, 21, корп. 1 в течение 30 календарных дней с даты опубликования данного сообщения.

**Телефоны для справок: 226 25 87, 222 96 75.**

УНП 600052664

**Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах»** по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № № 0493020, 0535193, 052352—0523525, 0536293, 0624491, 0282323—0282330; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР №№ 0638471—0638472 **считать недействительными.**

УНП 100706519